# АБАГУЛЬНЕННЕ ВОПЫТУ РАБОТЫ З НАВЕДВАЛЬНІКАМІ Ў ВІЦЕБСКІМ АБЛАСНЫМ КРАЯЗНАЎЧЫМ МУЗЕІ

**А. Л. Ісачанка,** *навуковы супрацоўнік метадычнага сектара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея*

Адным з кірункаў дзейнасці Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (ВАКМ) і яго філіялаў з’яўляецца культурна-адукацыйная дзейнасць, якая выяўляецца праз разнастайныя традыцыйныя і новыя формы. Паводле музеязнаўчай літаратуры вызначаюцца наступныя базавыя формы работы з наведвальнікамі: экскурсіі, лекцыі, кансультацыі, навуковыя чытанні (канферэнцыі, сесіі, пасяджэнні), гутаркі, студыі, конкурсы (алімпіяда, віктарына), сустрэчы з цікавымі людзьмі, канцэрты (літаратурны вечар, спектакль), святы, гістарычныя гульні [8, с. 491]. Да новых форм варта аднесці такія, як вяселле ў музеі, навагодняя ёлка, перфоманс, фестывалі, ярмаркі і інш. [6, с. 4].

Аналізуючы формы работы з наведвальнікамі за апошнія пяць гадоў, трэба адзначыць, што галоўная ўвага ў культурна-адукацыйнай дзейнасці Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і яго філіялаў надаецца экскурсіям. ВАКМ і яго філіялы праводзяць аглядныя і тэматычныя экскурсіі па экспазіцыях, акрамя таго, краязнаўчы музей прапаноўвае экскурсіі па гораду. У экскурсіях распавядаецца аб музейных прадметах, што знаходзяцца ў экспазіцыях, і аб падзеях з гісторыі горада. Экскурсіі з’яўляюцца класічнымі формамі работы, якія, спалучаючы аповед і паказ, даносяць да наведвальнікаў візуальную і адначасова вербальную інфармацыю аб аб’екце і падзеях, з ім звязаных, з’яўляюцца найбольш даступнымі і распаўсюджанымі. Відавочна, што экскурсія як форма культурна-адукацыйнай дзейнасці ў поўнай меры адпавядае мэтам папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, яна спалучае інфарматыўную і азнаямляльную функцыі, адпавядае патрэбам навучання, таксама баўлення вольнага часу і зносін
[7, с. 469].

Пастаяннымі формамі культурна-адукацыйнай дзейнасці ВАКМ і яго філіялаў з’яўляюцца лекцыі. Праводзіцца распрацоўка новых музейных лекцый. Напрыклад, за апошнія пяць гадоў у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчым музеі былі распрацаваны наступныя цыклы лекцый: «И восхищение, и боль…(история возникновения витебских церквей)», «Вышыўка па канве і вырабы з бісера», «Вайна 1812 года на Віцебшчыне», «Віцебск ў 1941–1945 гг.», «Творчасць Ю. М. Пэна», «Рускія мастакі ў мастацкім жыцці Беларусі XIX–XX стст.», «Акварэль: тэхніка, гісторыя развіцця» [3, с. 5]. Галоўнай мэтай такой формы работы з наведвальнікамі з’яўляецца выкладанне тэарэтычнага матэрыялу і ілюстраванне яго з дапамогай музейных прадметаў.

У ВАКМ праводзяцца музейныя і выязныя музейна-педагагічныя заняткі для дзіцячай аўдыторыі. Распрацаваны цыклы заняткаў «Прывітанне, музей!», «Жывёльны свет роднага краю», «Як нарадзіўся наш горад» і інш. [2, с. 7], на якіх дзяцей знаёмяць з прыродай роднага краю, дапамагаюць ім уявіць, як узнік і развіваўся горад. Дадзеныя заняткі разлічаны на розны ўзрост дзяцей і ўключаюць разнастайныя элементы работы, што спрыяюць навучанню дзіцячай аўдыторыі праз адпаведныя ўзросту метады. Акрамя таго, такія заняткі фарміруюць у дзяцей музейную культуру [7, с. 494].

Звычайнай формай для культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчага музея з’яўляюцца прэзентацыі выданняў, што звязаны з калекцыямі і профілем музея. Так, у 2008 г. адбыліся прэзентацыі матэрыялаў канферэнцыі «Ю. Пэн і яго час» і кнігі М. Макарава «Ад пасада да магдэбургіі» [2, с. 7], а ў 2009 г. у Ратушы – набору паштовак «Віцебск на фотаздымках Сігізмунда Юркоўскага» (у фондах ВАКМ налічваецца 27 сапраўдных фотаздымкаў Юркоўскага, вядомага ў Віцебску фатографа другой паловы XIX ст.) [3, с. 8]. Выданне такіх каштоўных для гісторыі Віцебска помнікаў важна для азнаямлення аўдыторыі з гістарычнымі каштоўнасцямі, а таксама для папулярызацыі збораў музея. У 2011 г. прайшла прэзентацыя фотаальбома «Віцебшчына ў 1941–1944 гадах: акупацыя і вызваленне» з выкарыстаннем фондавых матэрыялаў [5, с. 8].

Трэба адзначыць, што для кожнай выставы распрацоўваецца свой сцэнарый адкрыцця. Таму тут дарэчы тэатральныя, музычныя і іншыя элементы. Часам тэатралізаваныя прадстаўленні адкрываюць выставы дзіцячай творчасці.

Для Літаратурнага музея (філіяла ВАКМ) характэрны сустрэчы з паэтамі, пісьменнікамі і іншымі творчымі людзьмі («Вечар у крузе сяброў» праводзіцца не адзін год), вечары, прысвечаныя пэўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яве ў літаратурным жыцці, а таксама разнастайныя прэзентацыі кніг, адпаведных профілю філіяла. Усё гэта суседнічае з традыцыйнымі экскурсіямі. Наведвальнікаў музея прыцягваюць не толькі калекцыі, але і магчымасць асабістай сустрэчы з выдатным чалавекам. Напрыклад, у 2007 г. Літаратурны музей правёў сустрэчу, прысвечаную нараджэнню У. Караткевіча, творчую сустрэчу з пісьменнікамі-рэдактарамі і членамі рэдкалегій рэспубліканскіх часопісаў «Нёман», «Маладосць» і інш. [1, с. 8].

Музей прыватных калекцый спецыфічны па тэматыцы і абмежаваны ў варыятыўнасці форм культурна-адукацыйнай дзейнасці. Найбольш прыдатнай да тэматыкі музея прыватных калекцый і найбольш распаўсюджанай, акрамя экскурсій, з'яўляецца сустрэча з цікавым чалавекам, у прыватнасці з калекцыянерам. Улічваючы спецыфіку музея, яго пабудову, плануецца ўвядзенне новай формы работы з наведвальнікамі – аўдыягід (каментарыі на экспазіцыі, адначасова з традыцыйнай экскурсіяй).

Пастаяннымі формамі работы Мастацкага музея (таксама філіяла ВАКМ) з'яўляюцца экскурсіі і лекцыі. Аднак музей адметны тым, што, бадай, толькі ў ім сярод філіялаў ВАКМ існуе клубная форма работы з наведвальнікамі. Так, дзіцячая выяўленчая студыя «Цюбікі» ладзіць заняткі па мастацтве з дзецьмі і арганізоўвае выставы іх творчасці, што садзейнічае эстэтычнаму выхаванню і развіццю. Часам у Мастацкім музеі праводзяцца дзіцячыя конкурсы па розных відах мастацтва. Напрыклад, у 2008 г. музеем быў падрыхтаваны, арганізаваны і праведзены гарадскі дзіцячы конкурс выцінанкі
[2, с. 9].

Адметным у плане правядзення свят і мерапрыемстваў з'яўляецца музей-сядзіба І.Я. Рэпіна «Здраўнёва». Некаторыя з мерапрыемстваў музея сталі штогадовай традыцыяй. Тут праводзяцца цыклы каляндарна-абрадавых свят (Масленіцы, Раства, Купалля). Падчас свят музейнае значэнне атрымліваюць і духоўныя каштоўнасці, інакш кажучы, тут спалучаюцца «музейнасць» (сувязь з тэматыкай музея і яго калекцыямі) і «святочнасць», робіцца спроба адрадзіць традыцыю свята як адну з форм існавання культурнай спадчыны. Акрамя таго, сядзіба І. Я. Рэпіна з'яўляецца своеасаблівай пляцоўкай для творчасці, напрыклад, студэнтаў філалагічнага і мастацка-графічнага факультэтаў. Традыцыйнымі сталі пленэры для студэнтаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастакоў, творчыя сустрэчы факультэта («У гасцях у І. Я. Рэпіна», «Восеньскі букет» і інш.). Гэта фактычна адзіны філіял ВАКМ, дзе наваколле музея вельмі спрыяе правядзенню сапраўднага музейнага свята, якое спалучае абавязковае выкананне рытуалаў і святочнай атрыбутыкі, элементаў гульні і тэатралізацыі.

Для Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і яго філіялаў характэрна такая новая форма работы з наведвальнікамі, як святкаванне разнастайных каляндарных свят, напрыклад гаданне на Каляды ці правядзенне акцыі Дня святога Валянціна. Аднак спрэчным застаецца пытанне, наколькі такія мерапрыемствы адпавядаюць музейнаму асяроддзю. Мяркуецца, што правядзенне гаданняў больш апраўдана ў сценах музея. Падчас гаданняў наведвальнікам расказваюць аб старадаўніх абрадах, прапаноўваюць разнастайныя варыянты варажбы, і тым самым супрацоўнікі музея знаёмяць наведвальнікаў з нацыянальнымі фальклорнымі традыцыямі. Таму можна сказаць, што такая незвычайная прапанова адпавядае ў поўнай меры задачам культурна-асветнай работы музея. Што датычыцца Дня святога Валянціна, то, на першы погляд, гэта не вельмі прыдатнае свята для музея. Але мерапрыемствы на дзень усіх закаханых у краязнаўчым музеі і яго філіялах падтрымліваюцца разнастайнымі акцыямі і прапановамі. У Ратушы, напрыклад, можна здзейсніць экскурсію на аглядную пляцоўку, а таксама прыняць удзел у балі. Неабходна адзначыць, што ВАКМ падобнымі мерапрыемствамі пазіцыяніруе сябе як цэнтр сучаснага культурнага жыцця, забаўляльныя элементы тут цесна пераплятаюцца з экскурсіяй, адкрыццём выставы і іншым, што надае дзейнасці музея новыя, больш шырокія магчымасці [4, с. 7].

Работа з наведвальнікамі патрабуе перыядычнага з’яўлення новых незвычайных праектаў, якія актыўна ўкараняюцца ў краязнаўчым музеі і яго філіялах, напрыклад святкаванне Міжнароднага дня музея. З 2010 г. музей праводзіць такое мерапрыемства, як «Ноч музеяў». Гэта адносна новая комплексная форма работы, у якую ўваходзяць элементы экскурсіі, тэатральнай пастаноўкі, майстар-класы, перфоманс і інш. [4, с. 8]. Вялікую ролю адыгрывае супрацоўніцтва з прадстаўнікамі тэатра, музычных устаноў, тэлебачання. Такая форма работы набыла вялікую папулярнасць і прызнанне ў наведвальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2008 г. быў апрабаваны новы экскурсійны маршрут «Трамвай і тралейбус выхаднога дня», які быў наладжаны ВАКМ і ТТУ г. Віцебска. Удзельнікі падчас вандроўкі пачулі аповед аб гісторыі і славутых мясцінах Віцебска, праехалі па вуліцах горада. У 2010–2011 гг. экскурсаводамі музея праводзіцца экскурсія на параходзе па пэўным маршруце, што з’яўляецца таксама цікавай новай формай работы з наведвальнікамі [4; 5]. У апошні час у музеі арганізуюцца мерапрыемствы з нагоды святкавання Новага года для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і ў адпаведнасці з профілем музея.

Цікавай і нетрадыцыйнай формай работы музея з’яўляецца правядзенне вясельнага абраду, для чаго выкарыстоўваюцца залы і экспазіцыі музея для фота- і відэаздымкаў удзельнікаў вяселля, распрацоўваецца цікавы сцэнарый.

Такім чынам, на аснове аналізу справаздач музея аб дзейнасці за апошнія пяць гадоў можна адзначыць, што Віцебскі абласны краязнаўчы музей і яго філіялы выкарыстоўваюць самыя разнастайныя формы работы з наведвальнікамі. Найбольш папулярнымі і пастаяннымі з’яўляюцца экскурсіі, лекцыі і музейна-педагагічныя заняткі. Існуе таксама практыка правядзення прэзентацый розных выданняў, сустрэч з цікавымі людзьмі, шматлікіх майстар-класаў і арганізацыя разнастайных музейных свят. Для работы музея характэрна вялікая колькасць разавых мерапрыемстваў рознай тэматыкі і форм узаемадзеяння з аўдыторыяй. Відавочна, што магчымасці музея на гэтым не вычэрпваюцца.

1. *Справаздача* за 2007 г. УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей».

2. *Справаздача* за 2008 г. УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей».

3. *Справаздача* за 2009 г. УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей».

4. *Справаздача* за 2010 г. УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей».

5. *Бягучая* справаздача за 2011 г. (1–3 кварталы) УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей».

6. *Столяров, Б. А.* Музей в пространстве культуры и образования / Б. А. Столяров. – СПб., 2007.

7. *Юренева, Т. Ю.* Музееведение: учебник для высшей школы / Т. Ю. Юренева.– 2-е изд. – М.: Академический проект, 2004.

8. *Юхневич, М. Ю.* Новые музейные технологии музейного образования / М. Ю. Юхневич // Основы музееведения. – М., 2005.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ